

ДАПАМОГА БАЦЬКАМ — ЯК ПРЫГОДА 13

ТО ХЛЮПОТА, ТО МАРОЗ... 16




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+TV ПРАГРАМА

9 ЛЮТАГА 2024 г. ПЯТНІЦА № 28 (30162)


## КОРАТКА

• Колькасць рэзідэнтаў індустрыяльнага парка «Вялікі камень» дасягнула 127.

• **Белстат: у снежні 2023 года сярэдні памер пенсіі быў у 2,5 раза вышэйшы за БПМ для пенсіянераў.**

• Электронны кірмаш вакансій для саісканьнікаў з Капыльскага раёна пройдзе 14 лютага.

• **У Мінску амаль 86 працэнтаў дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, выхоўваюцца ў замяшчальных сем'ях.**



• Фрыстайлісты Мітрафанаў і Дзяруга сталі чэмпіёнамі Беларусі па лыжнай акрабатыцы.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Іван КУБРАКОЎ, міністр унутраных спраў:**

*«Аператыўная абстаноўка ў краіне застаецца стабільнай і пад кантролем. Рэалізаваны комплекс мер прафілактычнага характару станоўча адбіўся на стане рэцыдыўнай, бытавой і падлеткавай злачыннасці. Менш супрацьпраўных дзеянняў учынена ў грамадскіх месцах. Узмоцнена абарона грамадзян ад злачынных замахаў у сельскай мясцовасці, на пажылых людзей. Комплексна вырашаліся праблемы бяспекі дарожнага руху. Скарацілася колькасць аўтаавaрый, загінулых і параненых у іх асоб».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Мы працавітыя народы і гатовы сваё шчасце самі шукаць і знаходзіць»

## Аб выніках візіту Прэзідэнта ва Узбекістан

**Галоўнай падзеяй афіцыйнага візіту Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ва Узбекістан сталі перагаворы з Прэзідэнтам Узбекістана Шаўкатам Мірзіёевым. Месцам для перагавораў двух лідараў выбраны загарадны комплекс «Куксарой» — дзеючая дзяржаўная рэзідэнцыя Прэзідэнта Узбекістана.**



Фота БелТА.

### У АСНОВЕ АДНОСІН — РУПЛІВЫЯ ЛЮДЗІ

Падчас перагавораў у пашыраным складзе Аляксандр Лукашэнка ў першую чаргу падзякаваў узбекскаму боку за традыцыйна цёплы прыём дэлегацыі і трапяткое стаўленне да беларусаў. «Я вельмі цаню гэта. У нас з вамі абсалютна даверлівыя, сяброўскія адносіны. Напэўна, ужо больш даверлівых не бывае», — заявіў Прэзідэнт.

«Мы з вялікай цікавасцю назіраем за тымі пераўтварэннямі, якія праходзяць ва Узбекістане. Адзінае, што вам трэба, — гэта час. Упушчана было нямала. Вам даводзіцца, як вы правільна сказалі, даганяць, даганяць і даганяць, а гэта заўсёды няпроста. Але самае галоўнае — вы ведаеце, куды ісці. Вы развіваецеся ўзрушальнымі тэмпамі, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Мы як вашы сябры, блізкія браты заўсёды побач, таму што ўзбекскі і беларускі народы — гэта вельмі падобныя людзі, працавітыя, талерантныя. Самыя сапраўдныя працаўнікі. Гэта аснова нашых адносін».

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што беларускі бок задаволены тым, што наша брацкая рэспубліка — Узбекістан — інтэнсіўна развіваецца. «Мы зацікаўлены ў развіцці Узбекістана, таму што ўзялі ў Цэнтральнай Азіі вашу краіну за аснову», — падкрэсліў ён.

Моцную эканоміку, якой не страшныя ніякія ўзрушэнні, Прэзідэнт назваў падмуркам любой дзяржавы. Таму на парадку дня перагавораў прэзідэнтаў — вельмі вялікі эканамічны блок. Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, цяперашнія лічбы тавараабароту — амаль $600 млн — не адпавядаюць існуючаму патэнцыялу, хоць і з'яўляюцца рэкордным паказчыкам. «У найбліжэйшыя год-паўтара трэба выходзіць на $1 млрд і глядзець наперад, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Пакуль ёсць згода паміж урадамі і кіраўнікамі дзяржаў, трэба многае зрабіць. Моладзь заўтра прыйдзе да ўлады — яна іншая. У іх няма гэтага досведу, яны не праходзілі гэты шлях, які мы прайшлі. У нас у памяці ёсць усё. Таму трэба гэты час не страціць».

СТАР. 2

Спажывец

# ТАВАР З ПАДВОХАМ

## Наколькі эфектыўна працуе формула «праўда заўсёды на баку кліента»?

**Як сведчыць інфармацыя на дзвярах, прыём грамадзян у магілёўскай гарадской арганізацыі абароны спажыўцоў вядзецца па серадах з 17.00 да 19.00. Да варажбіткі не хадзі, каб праверыць, ці запатрабаваныя сёння паслугі гэтай арганізацыі. Нават не сумнявайцеся. У азначаны час пад дзвярыма будзе стаяць не адзін чалавек, а чарга. Падчас візіту карэспандэнта «Звязды» так і было. Ужо каля пяці гадзін у калідоры дзяжурыла некалькі чалавек. І людзі ўсё падыходзілі.**

### РЭКАРДСМЕН ПА СКАРГАХ

Большасць спажыўцоў прынесла на экспертызу абутак. Жанчына з чаргі расказвае пра сваю бяду:

— У ботаў адклеілася падэшва. Купіла ў прыватнай краме. Вельмі спадабаліся. Пачала насіць і стала заўважаць, што ногі крыху мокнуць, але асаблівага значэння гэтаму не надала. Вусцілку падсушу на батарэі і зноў нашу. А потым гляджу — падэшва адклеілася.

— А ў мяне ў насах ботаў праявіліся плямы іншага колеру, — падзялілася другая наведвальніца. — Каб вярнуць грошы, патрабавалі зрабіць экспертызу за свой кошт.

Мужчына паказвае бот, на якім адслойваецца верх. Гарантыя — 30 дзён, але ён і некалькі тыдняў на панасіў.

— Звароты па абутку вельмі шмат, гэты тавар сёння рэкардсмен па скаргах, — пацвярджае **старшыня арганізацыі Вольга БАРАНАВА**. — Сюжэт прыкладна адзін і той жа.

СТАР. 3

Актуальны клопат

# НЕ ЧАКАЮЦЬ, ПАКУЛЬ ПРЫГРЭЕ

## На Гомельшчыне дарожныя службы прыводзяць у парадак адзін з самых загружаных транспартных напрамкаў рэгіёна

**Рух па магістралі М-10 «Граніца Расійскай Федэрацыі — Гомель — Кобрын» вельмі інтэнсіўны: у сярэднім, штодзень па гэтым напрамку рухаецца да 8 тысяч аўтамабіляў, у тым ліку вялікагрузы вагой да 70 тон. Стан дарожнага палатна на некаторых участках аўтадарогі выклікае занепакоенасць улад, супрацоўнікаў ДАІ і аўтамабілістаў.**

СТАР. 4



Фота Наталлі КАПРЫЛЕНКІ.

ISSN 1990 — 763X

# «Мы працавітыя народы і гатовы сваё шчасце самі шукаць і знаходзіць»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Кіраўнік дзяржавы заявіў, што Беларусь гатова ўнесці свой уклад у мадэрнізацыю Узбекістана: «Тыя тэхналогіі, якія вам патрэбны на сёння і нават заўтра, у нас ёсць. Не трэба нідзе хадзіць па свеце і кланяцца. Мы вам гэта прапануем з адкрытым сэрцам, нічога не патрабуючы ад вас. І запатрабаваць не можам: мы роўнавялікія, аднолькавыя краіны — што мы будзем адзін ад другога патрабаваць. Толькі на добрай аснове мы можам з вамі супрацоўнічаць, і вы таксама з намі».

## «ПАКУЛЬ НАВУЧЫМ, БУДЗЕМ ВАМ ДАПАМАГАЦЬ»

Аляксандр Лукашэнка прапанаваў актыўна ствараць сумесныя фармацэўтычныя вытворчасці. Узбекістан зацікаўлены ў пастаўках лекаў, таму гэты кірунак вельмі актуальны для краіны.

Старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Каранік адзначыў, што бакі падрабязна абмяркоўваюць гэта пытанне. Беларусь і Узбекістан хочуць прааналізаваць нарматыўную базу, каб спрасціць рэгістрацыю прэпаратаў і скласці пералік найбольш запатрабаваных лекавых сродкаў. «З перспектывай продажу ў суседнія краіны», — сказаў губернатар.

«Што датычыцца тэхнічнай рэгістрацыі. Слухайце, у нас жа «дыктатура» — мы ж пытанне можам вырашыць хутка. Галоўнае, каб у вас была дамоўленасць, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Давайце разам гэта ствараць». У сваю чаргу Шаўкат Мірзіёеў запэўніў, што ўзбекскі бок гатовы даць гарантыі па набыцці беларускай фармацэўтычнай прадукцыі на неабходную колькасць гадоў. «Ваша якасць нас задавальняе», — заявіў ён.

Беларусь гатова падставіць плячо Узбекістану і ў ахове здароўя, асабліва ў галіне аховы мацярынства і дзяцінства. «Мы гатовы ад сябе адарваць, прыехаць, запусціць, як трэба, гэту клініку, дапамагчы вам укамплектаваць, навучыць акушэрству вашых людзей. Але пакуль навучым, будзем вам дапамагаць. Мы заўсёды перад жанчынамі абавязаны нешта зрабіць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

У сваю чаргу, Шаўкат Мірзіёеў прапанаваў наладзіць сумесны выпуск БелАЗаў ва Узбекістане. «Мы адкрыты. Не з усімі краінамі ў нас такая даверная, шчырая размова. Мы гаварылі больш за дзве гадзіны (у вузкім фармаце. — **«Зв.»**) — мы пра ўсё пагаварылі. Але вы ведаеце, многае ад вас залежыць», — звярнуўся Шаўкат Мірзіёеў да членаў дэлегацый.

«Цяпер нам нічога не перашкаджае. Мы вельмі сур'ёзна настроены нарошчваць горна-металургічную галіну. Нам патрэбны БелАЗ. Нам ужо тут лакалізацыя патрэбна, сумеснае прадпрыемства трэба. Мы будзем будаваць медна-абагачальныя фабрыкі — трэцюю, чацвёртую, пятую. Гэта колькі машын нам трэба. Мы столькі гадоў навучалі нашых інжынераў, сярэдні персанал працаваць на БелАЗах. Чаму б нам сумесна не выпускаць гэтыя БелАЗы?» — спытаў Шаўкат Мірзіёеў.

## ЯКАСЦЬ — ГЭТА НАДОЎГА, НЕ НА АДЗІН ГОД

Аляксандр Лукашэнка расказаў, што 2024 аб'яўлены ў Беларусі Годам якасці. «Гэта надоўга, не толькі адзін год», — падкрэсліў ён. Развіццю і мадэрнізацыі вытворчасцяў у Беларусі цяпер удзяляюць асаблівую ўвагу. Тым больш айчынная прадукцыя вельмі запатрабавана на суседніх рынках дзякуючы сваёй якасці.

Пры гэтым Беларусь гатова не проста пастаўляць тэхніку, а ствараць на месцах сэрвісныя цэнтры для яе абслугоўвання. Такі досвед назапашаны ўжо даўно. «Было б выдатна. Калі ёсць сэрвіс, фермеры зусім па-іншаму ставяцца, — адзначыў Шаўкат Мірзіёеў. — У нас з 10 трактароў 5 — з Беларусі». Прэзідэнт Узбекістана даручыў сваёй дэлегацыі ўзяць гэтыя пытанні на асаблівы кантроль. «З 10, карацей, павінна быць 7», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Падчас перагавораў прэзідэнты заслухалі даклады профільных міністраў аб тым, як развіваецца супрацоўніцтва па шэрагу кірункаў, якія вынікі ўжо дасягнуты і што патрабуе неадкладнага рашэння. Узбекскі лідар разлічвае, што сёлетні візіт Аляксандра Лукашэнкі ва Узбекістан стане гістарычным. Бо краінам трэба надаць імпульс двухбаковаму супрацоўніцтву рэалізаваць шмат новых сумесных праектаў.

## РЭЗЕРВАЎ ДЛЯ РОСТУ ДАСТАТКОВА

Прэзідэнты Беларусі і Узбекістана па выніках перагавораў у Ташкенце прынялі сумесную заяву. У ім Аляксандр Лукашэнка і Шаўкат Мірзіёеў адзначылі, што Беларусь і Узбекістан прадоўжаць прыкладаць намаганні для далейшага развіцця партнёрства.

Кіраўнікі дзяржаў падкрэслілі, што прыярытэтны кірунак беларуска-ўзбекскіх адносін — далейшае пашырэнне ўзаемавыгаднага гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва. Імі адзначана дадатная дынаміка аб'ёмаў двухбаковага гандлю, але разам з тым указана на наяўнасць значнага нявыкарыстанага патэнцыялу для павелічэння тавараабароту.

«Бакі пагадзіліся з важнасцю нарошчвання аб'ёмаў узаемнага гандлю і пашырэння яго наменклатуры шляхам уключэння ў тавараабарот прадукцыі з высокай дабаўленай вартасцю, фарміравання спрыяльных умоў для транзіту знешнегандлёвых грузаў, развіцця супрацоўніцтва паміж суб'ектамі прадпрымальніцтва, прыватнага сектара і рэгіёнамі дзвюх краін», — гаворыцца ў дакуменце.

Прэзідэнты таксама канстатавалі неабходнасць стварэння спрыяльных умоў для актыўнага развіцця механізмаў падтрымкі экспартна-імпартных аперацый, а таксама для правядзення на рэгулярнай аснове выставак прамысловай, сельскагаспадарчай, харчовай і тэхналагічнай прадукцыі, бізнес-форумаў, сустрэч і перагавораў паміж дзелавымі коламі.

Адным з прыярытэтных кірункаў двухбаковага супрацоўніцтва прэзідэнты назвалі ўзаемадзеянне паміж рэгіёнамі. Падкрэслена прыярытэтнае значэнне супрацоўніцтва ў сельскай гаспадарцы, комплексным развіцці сувязяў па лініі аграпрамысловых комплексаў, гарантавання харчовай бяспекі.

Кіраўнікі дзяржаў таксама пацвердзілі прыхільнасць да далейшага ўмацавання двухбаковых сувязяў у культуры, адукацыі, навуцы, мастацтве, кінематаграфіі, турызме, маладзёжнай палітыцы і спорце. У 2024—2025 гадах бакі маюць намер арганізаваць Дні культуры Беларусі ва Узбекістане і Дні культуры Узбекістана ў Беларусі.

Аляксандр Лукашэнка і Шаўкат Мірзіёеў адзначылі неабходнасць нарошчвання супрацоўніцтва ў барацьбе з тэрарызмам, незаконным абаротам наркотыкаў і зброі, распаўсюджваннем зброі масавага знішчэння, іншымі выклікамі і пагрозамі рэгіянальнай і міжнароднай бяспецы. Бакі дамовіліся прадоўжыць узаемадзеянне на міжнароднай арэне і выказалі ўзаемнае імкненне да развіцця супрацоўніцтва ў ААН, СНД, ШАС і іншых глабальных і рэгіянальных структурах.

## ГАЛОЎНЫЯ АРЫЕНЦІРЫ — ІМПАРТАЗАМЯШЧЭННЕ І ТЭХНАЛАГІЧНЫ СУВЕРЭНІТЭТ

Па выніках перагавораў Аляксандр Лукашэнка заявіў журналістам, што Беларусь і Узбекістан пацвердзілі прынцыповую нацэленасць на выбудоўванне супрацоўніцтва ва ўсіх кірунках. Кіраўнік дзяржавы расказаў, што перагаворы прайшлі ў выключна адкрытай, дружалюбнай, брацкай абстаноўцы, былі змястоўнымі і рэзультатыўнымі. «Мы разгледзелі шырокі спектр пытанняў і пацвердзілі прынцыповую нацэленасць на выбудоўванне супрацоўніцтва ва ўсіх кірунках, дзе ў Мінска і Ташкента ёсць сумесныя праекты», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле яго слоў, у першую чаргу размова ідзе аб гандлёва-эканамічнай сферы. У цэлым краіны маюць тут неблагія вынікі. За мінулы год тавараабарот перавысіў новы гістарычны максімум паўмільярда долараў.

«Тым не менш разумеем, што рэзервы вялікія», — падкрэсліў Прэзідэнт. Адзін з іх — стварэнне новых і пашырэнне ўжо існуючых партнёрскіх сувязяў на ўзроўні абласцей дзвюх краін. «І форум рэгіёнаў, які прайшоў напярэдадні ў Ташкенце, гэта пацвердзіў. На жаль, за перыяд пандэміі кантакты недзе аслаблі. Але цяпер самы час іх аднавіць і напоўніць канкрэтнымі праектамі. Іх нямала», — заўважыў беларускі лідар.

У якасці прыярытэтных пытанняў у час перагавораў абмяркоўваліся паглыбленне вытворчай кааперацыі, стварэнне сумесных прадпрыемстваў, забеспячэнне спрыяльных умоў для абмену таварамі і паслугамі. «Пры гэтым у арганізацыі сумесных вытворчасцяў мы нацэлены на доўгатэрміновае супрацоўніцтва і планамерную іх лакалізацыю, што забяспечыць стварэнне новых рабочых месцаў ва Узбекістане. Галоўныя арыенціры — імпартазамяшчэнне і тэхналагічны суверэнітэт, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — З улікам вытворчых і інтэлектуальных рэсурсаў нашых краін заўважны патэнцыял у машынабудаванні, аграпрамысловым комплексе, лёгкай прамысловасці. Мы асобна спыніліся на тэме паглыблення кааперацыі ў сферы фармацэўтыкі, уключаючы пытанні вырабу ва Узбекістане беларускіх лекавых прэпаратаў і стварэння новых сумесных вытворчасцяў».

Аляксандр Лукашэнка запрасіў свайго калегу наведаць Беларусь з візітам ужо сёлета і выказаў упэўненасць у тым, што пасля праведзеных у Ташкенце падрабязных і прынцыповых перагавораў бакі змогуць значна зрушыць наперад двухбаковае супрацоўніцтва на працягу года. «Думаю, мы за год значна больш зробім. Сёння ўсе зразумелі, у якім напрамку рухацца і як хутка трэба рухацца і вырашаць пытанні. Будзем падтрымліваць узбекскі народ і Узбекістан, наколькі можам. Толькі каб вы дасягнулі мэт, якія перад сабой паставілі», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што Беларусь у супрацоўніцтве з іншымі краінамі прапануе шырокі парадак дня і асабліва пытанні, звязаныя з абменам тэхналогіямі. Апаненты і нядобразычліўцы часам ставяць пад сумненне тое, што Беларусь, будучы невялікай краінай, прапануе нейкія тэхналогіі. Кіраўнік дзяржавы ў сувязі з гэтым нагадаў, што ў Беларусі высокатэхналагічныя галіны былі развіты яшчэ з часоў Савецкага Саюза — так склалася раздзяленне працы і вытворчая спецыялізацыя ў той агульнай дзяржаве. «Мы не растрацілі гэта за перыяд 1990-х гадоў і цяпер. Прэзідэнт (Узбекістана) гэта добра ведае, ён вельмі добра ведае Беларусь», — падкрэсліў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка прывёў у прыклад магутную бавоўняную вытворчасць у Беларусі, сыравінай для якой служыла якраз бавоўна з Узбекістана: «Адсюль атрымлівалі, перапрацоўвалі і пастаўлялі на экспарт, гэта значыць мы peralапачвалі вялікую колькасць экспартнай прадукцыі. А для гэтага патрэбны былі высокія тэхналогіі. Бо за мяжой не купяць, калі дрэнна. Нам пашанцавала ў гэтым плане».

Кіраўнік дзяржавы таксама нагадаў, што Беларусь моцна пацярпела ў гады Вялікай Айчыннай вайны, і іншыя рэспублікі Саюза дапамагалі аднавіцца ў пасляваенныя гады, агульнымі намаганнямі была створана асноўная высокатэхналагічная індустрыяльная база. Усё гэта захавана і ў асноўным знаходзіцца ў руках дзяржавы. Вызначаныя высокія вынікі дасягнуты і ў сельскай гаспадарцы. «Я гэта кажу да таго, што сёння Беларусь мае ўсё тое, што сёння і заўтра трэба тэхналагічна Узбекістану. Гэта таму, што мы стаім на плячах гігантаў, якія стварылі тое, што мы сёння маем у Беларусі. І мы брацкія рэспублікі, правільна сказаў Прэзідэнт. Беларусы і ўзбекі вельмі падобныя народы — талерантныя, гнуткія, яны не глядзяць у агарод чужым людзям, ні ў кога нічога не адбіраюць, не збіраюцца ваяваць. Мы працавітыя народы і гатовы сваё шчасце самі шукаць і знаходзіць».

**Паводле БелТА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Ільхам Аліеў перамог на прэзідэнцкіх выбарах у Азербайджане



Дзейны прэзідэнт Азербайджана Ільхам Аліеў лідзіруе на пазачарговых выбарах кіраўніка дзяржавы з больш чым 92 працэнтамі галасоў. Такія звесткі прывёў кіраўнік ЦВК Азербайджана Мазахір Панахаў па выніках апрацоўкі звыш 93 працэнтаў бюлетэняў. На другім месцы апынуўся дэпутат парламента і самавылучэнец Захід Орудж, які набраў 2,19 % галасоў. Лідар Партыі вялікага стварэння Фазіль Мустафа атрымаў 2 % галасоў, дэпутат парламента і лідар партыі «Адзіны народны фронт Азербайджана» Гудрат Гасангуліеў — 1,76 %, лідар партыі «Нацыянальны фронт» Разі Нурулаеў атрымаў 0,8 %, лідар партыі «Вялікі Азербайджан» Эльшад Мусаеў — 0,67 %, самавылучэнец, былы лідар Ліберальна-дэмакратычнай партыі Азербайджана Фуад Аліеў — 0,53 %. Па словах кіраўніка ЦВК, пасля закрыцця выбарчых участкаў назіральнікі МПА СНД не зафіксавалі ніякіх парушэнняў, якія маглі б паўплываць на вынік галасавання.

## У КНДР назвалі ЗША «бяззубым ваўком», чыя эпоха дамінавання падышла да канца

Эпоха, калі ЗША былі адзінай звышдзяржавай у свеце, назаўжды сышла, і цяпер Вашынгтон уяўляе сабой «бяззубага ваўка». Такое меркаванне выказаў навуковы супрацоўнік Інстытута па справах Японіі пры МЗС КНДР Кім Соль Хва. «Каб падтрымліваць сваю гегемонію, якая з кожным днём аслабляецца ў структуры «другой халоднай вайны», цяпер ЗША шалёна звяртаюцца да фабрыкацыі трохбаковага ваеннага альянсу з Японіяй і марыянеткамі», — адзначаецца ў яго артыкуле, апублікаваным Цэнтральным тэлеграфным агенцтвам Карэі, паведаміла ТАСС. Спробы стварыць саюз з «галоўнымі саюзнікамі» Кім Соль Хва параўнаў з тым, як «тапелец хапаецца за саломінку». «Назаўжды прайшла эпоха, калі ЗША выдавалі сябе за адзіную ў свеце звышдзяржаву», — піша ён, адзначаючы, што «няма больш неразумнай і дурной справы, чым спробы стварыць гарантыі бяспекі ў апоры на «бяззубага ваўка», якія імкнецца падтрымаць астатак свайго жыцця».

## Парыж пазбаўляецца ад пазадарожнікаў



Цяжкім аўтамабілям не месца на вуліцах французскай сталіцы. Так лічаць парыжане, якія большасцю галасоў падтрымалі трайное павелічэнне платы за паркоўку пазадарожнікаў. За ініцыятыву прагаласавалі 54,5 працэнта ўдзельнікаў міні-рэферэндуму, паведаміў Euronews. Прапанаваны мэрам Ан Ідальга план накіраваны на аўтамабілі вагой больш за 1,6 тоны. Калі ў маі Гарадская рада ўхваліць новыя тарыфы, то з верасня яны складуць 18 еўра за гадзіну ў цэнтральных раёнах і 12 еўра — у прыгарадах. Такім чынам шасцігадзіннае знаходжанне на паркоўцы ў цэнтры абыдзецца ў 225 еўра (для невялікіх аўто сума ў тры разы меншая). Ідальга такім чынам спадзяецца палепшыць якасць паветра ў горадзе і зрабіць яго бяспечным для веласіпедыстаў і пешаходаў напярэдадні Алімпійскіх гульняў, якія Парыж прыме ў сябе гэтым летам. Апаненты крытыкуюць новыя меры, абвінавачваючы мэра-сацыяліста ў дыскрымінацыі і «экадыктатуры».

# ТАВАР З ПАДВОХАМ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Чалавек купіў абутак, але праз некалькі дзён або тыдняў пачаліся праблемы. Прадавец адмовіўся вярнуць грошы, і спажывец ідзе да нас. Кожны вытворца дае свой гарантыйны тэрмін. Некаторыя абмяжоўваюцца тыднем. Насамрэч гарантыя па абутку на схаваныя дэфекты вытворчага характару — два гады. На працягу гэтага часу спажывец мае права выказаць прэтэнзію прадаўцу.



У арганізацыю шмат хто звяртаецца, каб зрабіць экспертызу. Яна платная, але аплачваць яе можна часткамі. Што датычыцца абутку, то ўжо праз тыдзень (па законе, на гэта адводзіцца два тыдні) кліент забірае заключэнне, дакументы і абутак. З усім гэтым ён ідзе да прадаўца, і звычайна пытанняў па вяртанні няякаснага тавару не ўзнікае. Але ёсць і іншыя выпадкі. У арганізацыі расказалі, як шмат непрыемнасцяў спажыўцам дастаўляе крама кітайскага абутку. Рэкордная колькасць скаргаў на гэтага гандляра паступала ў 2021 годзе.

— Людзей не выслухоўвалі, не выдавалі па першым патрабаванні Кнігу заўваг і прапаноў, — расказвае кіраўнік арганізацыі. — Мы нават РАУС падключалі, каб тыя закон не парушалі. Праводзілі экспертызы, пацвярджалі, што прысутнічае брак, але яны і ў гэтым выпадку не вярталі грошы за абутак. Маўляў, два тыдні насілі, мы не будзем забіраць. Тое, што яны парушаюць заканадаўства, іх не турбуе. І па сёння спажыўцы працягваюць звяртацца да нас з бракаваным абуткам з гэтай крамы.

У журнале рэгістрацыі спажыўцоў можна вывучаць усе дэфекты, якія праяўляюцца ў абутку падчас яго эксплуатацыі. І чаго толькі тут няма: і ссяданне задніка, і расколіны, і трэснутыя падэшвы, і нават скрып.

— Без браку, па сутнасці, ніводнае прадпрыемства не працуе, — канстатуе эксперт па абутку Іван Русакоў. — Дзесьці бывае схаваны дэфект, які выяўляецца пры носцы. Але імпартныя абутак менш якасны, чым айчынны. Шмат трэшчын падэшвы, адклейванне яе ад верху, у ботах са штучнай скуры трэскаецца верх, адслойваецца плёнка.

Скаргі на абутак праходзяць праз увесь журнал чырвонай ніткай. Ёсць прэтэнзіі да дзіцячага абутку і нават да таго, што прызначаны для актыўнага адпачынку. Здавалася б, па гэтых пазіцыях наогул пытанняў наконт трываласці не павінна быць. Нічога падобнага, кліент вунь і тыдзень не панасіў спартыўнага ўзору боты, а ўжо адарвалася падэшва.

## ДА ГУЗІКАЎ ПРЭТЭНЗІЙ НЯМА...

Памятаеце неўміручы маналог Аркадзя Райкіна пра «Атэлье»? Ён яшчэ там у такім перакошаным касцюме стаіць і пытаецца: «Хто шыў пінжак?» Сатырык пасмяяўся, мы разам з ім, але высновы ніхто не зрабіў. Магілёўская арганізацыя абароны спажыўцоў ужо амаль год вырашае праблему няякаснага рамонту курткі. Магіляўчанка набыла яе на адным з маркетплейсаў і захацела крыху звузіць. Звярнулася ў майстэрню па рамонце, але там ёй выраб толькі сапсавалі. Эксперт арганізацыі ўстанавіла, што «асіметрыя полачак вятроўкі ніжняй часткі адбылася пасля таго, як выраб быў завужаны па бакавых швах. Выраб не падлягае аднаўленню». Застаецца выкінуць куртку на сметніцу, але майстрыха, як у таго Райкіна, свае недаробкі не прызнае.

— Экспертыза, якая пацвердзіла няякасную работу, была праведзена яшчэ летась, а справа не заканчваецца, — расказвае Вольга Баранава. — Адзін суд мы выйгралі, цяпер чакаем наступны. Адказчыца ўпарта адмаўляецца вяртаць грошы за сапсаваную куртку і пагашаць судовыя выдаткі. Суддзя прапанавала адказчыцы зрабіць экспертызу за свой кошт, калі яна не згодная з той, якая праводзілася, і яна пагадзілася. Куртку запакавалі, апячаталі, але на экспертызу яна адпраўлена так і не была. Спажывец — жанчына паважанага ўзросту— нервуецца, перажывае, а індывідуальная прадпрымальніца паграджае, што зацягне судовыя працэдуры.

## НА ДРУГІМ МЕСЦЫ — ПОМНІКІ

У арганізацыі працуюць эксперты па абутку, адзенні, помніках, бытавой тэхніцы, вокнах, дзвярах, ювелірных вырабах. Паслугі ўсіх запатрабаваныя.

Арганізацыя абароны спажыўцоў гарадская, але людзі звяртаюцца нават з Гомеля, Полацка, раёнаў Магілёўскай вобласці. Камусьці парадай дапамагаюць, кагосьці накіроўваюць у іншыя інстанцыі. З пачатку года ў арганізацыю ўжо паступіла 60 зваротаў. За мінулы год звярнуліся 3100 чалавек, у пазамінулы — 3900. Пакуль арганізацыя працуе раз на тыдзень, а з 1 сакавіка будзе чатыры разы на тыдзень.

— Упраўленне гандлю таксама абараняе інтарэсы пакупнікоў, але часцей за ўсё яны накіроўваюць людзей да нас, — кажа суразмоўніца. — І на судовых пасяджэннях, дзе разбіраюцца прэтэнзіі спажыўцоў, прысутнічаем толькі мы.

Наогул, палітра няякаснага тавару і паслуг вельмі шырокая. Прадпрымальныя людзі зарабляюць на ўсім. Бывае, што звяртаюцца з прэтэнзіяй нават па прадукты харчавання. У журнале рэгістрацыі спажыўцоў скаргі на дэфектныя вокны, дзверы, мабільнікі, тэлевізары, з адзінкавых тавараў — на тату-машынку, матрац, нават швабру коштам амаль тысячу рублёў фірмы Кёрхер. Крамы апошняга вытворцы пазачыняліся, а звароты дагэтуль паступаюць. У памяшканні арганізацыі стаіць невялічкі культыватар, які кліентка набыла летась. Эксперт арганізацыі ўстанавіла там завадскі брак. У краме, дзе яго прадалі, адмовіліся ісці насустрач спажыўцу і вярнуць грошы. Так што хутка справа будзе разглядацца ў судзе.

Вольга Баранава ўспомніла выпадак, калі пенсіянерка наняла майстра зрабіць рамонт у прыватным доме. Грошы адразу ж аддала, мужчына ёй узамен — распіскі. А вось абавязацельствы свае не выканаў. Дэмантаж правёў, люстру пры гэтым разбіў і — прапаў. Калі справа дайшла да суда, высветлілася, што на «майстра» маецца стос скаргаў. А з падманутых ім спажыўцоў утварылася чарга.

Па помніках прэтэнзій не менш, чым па абутку. Ёсць індывідуальная прадпрымальніца, на якую, напэўна, кожны з яе кліентаў скардзіцца.

— Гэта наша гераіня з 2019 года, — кажа Вольга Баранава. — Шквал зваротаў на яе паслугі. Прадпрымальніца працуе то пад адным прозвішчам, то пад іншым. Набярэ грошай, назаключае дагавораў і нічога не робіць. А грошы немаленькія — фігуруюць сумы ад трох тысяч і вышэй. У асноўным на яе скардзяцца пенсіянеры. Яна добры мастак, але дагаворы не выконвае. Ужо за студзень пяць зваротаў па гэтай прадпрымальніцы. У снежні мы перадалі па ёй у суд чатыры іскавыя заявы. Летась на яе была заведзена крымінальная справа, але яна працягвае заключаць дагаворы.

## ЗАСТАЛІСЯ БЕЗ АДПАЧЫНКУ

Калі нехта вырашыў, што ва ўсіх бедах вінаватыя толькі прадпрымальнікі, ён памыляецца. У журнале рэгістрацыі спажыўцоў зафіксаваны факт, калі пенсіянеры адчулі сябе падманутымі... санаторыем.

— Муж з жонкай аплацілі пуцёўку за поўны кошт на 14 дзён у адзін з вядомых і вельмі дарагіх беларускіх санаторыяў, — расказвае Вольга Баранава. — Пералічылі ўстанове грошы на разліковы рахунак. Дабіраліся туды і на цягніку, і на маршрутках. Прыехалі, а ім кажуць: прабачце, нумары вашы не гатовыя. Сужэнцы разгубіліся: як так? Паслуга ўжо цалкам аплачана, а іх, як той казаў, не чакалі. Пенсіянерам прапанавалі прыйсці праз дзянёк, бо ў нумары беспарадак. Мужчына паказваў фота: ніякіх перабольшанняў. У нумары поўны вэрхал. Чакаць суткі пенсіянеры не сталі, бо яны не мясцовыя, а значыць, спатрэбіліся б дадатковыя выдаткі. Паспрабавалі дабіцца выканання паслуг ад адміністрацыі ўстановы, а ім сказалі, што іх не трымаюць. Толькі грошы вяртаць адмовіліся. Мы займаліся гэтым санаторыем месяцаў дзевяць, пісалі прэтэнзіі, размаўлялі па тэлефоне. Але грошы яны вярнулі толькі тады, калі мы напісалі іскавую заяву ў суд. На першым пасяджэнні мы дамовіліся мірна вырашыць пытанне. А на другім заключылі міравую. Грошы былі пераведзены на працягу пяці дзён. Кампенсавалі, у тым ліку сродкі за білеты і за маральную шкоду.

**Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.**

### ПАРАДЫ АД СПЕЦЫЯЛІСТА

1. Перад тым як звяртацца па паслугі або рабіць пакупку, азнаёмцеся з водгукамі.

2. Калі заказваеце паслугі праз сайт, паглядзіце, які статус мае майстар. Сёння шмат хто выступае як фізічная асоба. Спрэчныя пытанні можна вырашыць праз выканкам.

3. Захоўвайце чэк, забяспечце сведку або іншае, што можа пацвердзіць: тавар набываўся менавіта ў гэтай краме.

4. Уважліва вывучайце на сайце інфармацыю аб прадаўцы, паглядзіце, які орган яго рэгістраваў.

5. Вельмі карысна ведаць, што адносіны паміж прадаўцамі і спажыўцамі рэгулюе Закон Рэспублікі Беларусь «Аб абароне праў спажыўцоў» ад 9 студзеня 2022 года.

Інтэграцыя

# «СЛАВЯНСКАЯ КУЛЬТУРА — ГЭТА НЕШТА НЕДАСЯЖНАЕ»

## Якія мерапрыемствы Саюзнай дзяржавы гэта дакажуць?

**У 2024 годзе мерапрыемстваў культурнага і адукацыйнага характару на прасторы Саюзнай дзяржавы будзе больш. Іх каляндар і асаблівасці правядзення абмеркавалі падчас пасяджэння Камісіі Парламенцкага сходу па культуры, навуцы і адукацыі. У размове з журналістамі старшыня камісіі, першы намеснік старшыні Камітэта Дзярждумы Федэральнага Сходу РФ па развіцці грамадзянскай супольнасці, пытаннях грамадскіх і рэлігійных аб'яднанняў Мікалай БУРЛЯЕЎ падкрэсліў, што камісія маладая, таму планы ў яе грандыёзныя. «Калі мы прыйшлі ў гэтую камісію, то ўбачылі ўсяго 11-12 праектаў у галіне культуры, навукі і адукацыі. І мы палічылі гэта недастатковым для таго, каб развіваць і культуру, і навуку, і адукацыю Саюзнай дзяржавы.**

Мы прапанавалі каля 40 новых праектаў, але яны вельмі цяжка праходзяць, паколькі тая дакументацыя, якая патрабуецца ад аўтараў праектаў, вельмі груваствкая, усе гэтыя патрабаванні цяжка прайсці творчым людзям, гэта такі больш рыначны падыход, а асабіста для мяне, які ўсё жыццё аддаў культуры, паняцці «культура» і «рынак» несумяшчальныя, тут трэба мераць іншымі катэгорыямі. Таму ў мяне вельмі шмат пытанняў, але ў нас яшчэ ёсць час папрацаваць, падумаць усім разам. Бо я ўпэўнены, што ўсе мы хочам дабра для культуры, для навукі і для адукацыі. Работы шмат, але дарогу адолее той, хто ідзе», — расказаў ён.

Мікалай Бурляеў распавёў пра некаторыя новыя праекты, прапанаваныя камісіяй. Сярод іх, напрыклад, маладзёжны хор прафесіяналаў экстра-класа, сабраны з 30 выпускнікоў Маскоўскай дзяржаўнай кансерваторыі і 20 выпускнікоў Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі. Аркестр прапануецца стварыць па мадэлі ўжо створанага саюзнага аркестра пад кіраўніцтвам Юрыя Башмета. «У нашых краінах ёсць вельмі таленавітыя галасы, каб стварыць малады хор, які будзе спяваць усё: і беларускія, і рускія песні, і духоўную музыку, і класіку», — падкрэсліў Мікалай Бурляеў. Па яго словах, плануецца стварыць аналагічны знакамітаму «Славянскаму базару» славянскі форум.

«Мы не займаемся эстрадай, шоу-бізнесам, таму што не лічым шоу-бізнес культурай. Я ўжо ў нашым парламенце гаварыў аб тым, што ў Мінкультуры павінны задумацца аб тым, каб вывесці шоу-бізнес з паняцця «культура», таму што гэта не культура, гэта бізнес, прыбытковы промысел, які паніжае духоўны ўзровень нашага народа і нашай Саюзнай дзяржавы.Таму Славянскі форум мастацтваў, які будзе створаны ў Маскве, гэта будзе дадатак да «Славянскага базару». Вось толькі форум будзе займацца высокай музыкай, будуць запрошаны найлепшыя аркестры, у нас ёсць Валерый Гергіеў, Юрый Башмет, Уладзімір Федасееў, будзем запрашаць з Сербіі, з нашых брацкіх краін, каб паказаць усю вышыню славянскай культуры. А гэтая вышыня не ў шоу-бізнесе. Славянская культура — гэта нешта недасяжнае ў галіне музыкі, літаратуры, жывапісу, тэатра, кіно, гэта асаблівая культура. Вось гэтым і будзе займацца Славянскі форум мастацтваў. Ёсць яшчэ вельмі шмат праектаў, якія давядзецца адстойваць, даказваць і расказваць выканаўчай уладзе, наколькі гэта важна для таго, каб Саюзная дзяржава прадставіла ўсяму свету мадэль новай дзяржавы, цывілізацыі абсалютна новай, прасвятленай, гарманічнай, высокай па памкненнях, таленавітай, на якую ўвесь свет будзе глядзець. І Уладзімір Пуцін, і Аляксандр Лукашэнка амаль адначасова прынялі свае ўказы аб дзяржаўнай культурнай палітыцы, якія і ў Расіі, і ў Беларусі аналагічна грунтуюцца на традыцыйных духоўна-маральных катэгорыях. Вось гэта мы будзем праводзіць у жыццё», — адзначыў Мікалай Бурляеў.

Сёлета пройдуць і ўжо знаёмыя мерапрыемствы. Сярод іх — алімпіяды школьнікаў Саюзнай дзяржавы, з'езд юных эколагаў, форум «Расія і Беларусь. Агульная гісторыя, агульны лёс», конкурс навукова-тэхнічнай творчасці, грамадзянска-патрыятычная кадэцкая змена, форум ВНУ Саюзнай дзяржавы. Мноства мерапрыемстваў будзе прысвечана 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і сьвяткаванню перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Самае знакавае — акцыя «Цягнік Памяці». Сёлета арганізатары плануюць пашырыць колькасць удзельнікаў акцыі, запрасіць маладых людзей з іншых краін. Таксама на прасторы Саюзнай дзяржавы будуць праходзіць мерапрыемствы сацыяльнага блока, накіраваныя на захаванне культурна-гістарычных каштоўнасцяў Беларусі і Расіі.

Падчас пасяджэння члены камісіі падвялі папярэдня вынікі выканання бюджэту Саюзнай дзяржавы за 2023 год па кірунках дзейнасці Камісіі Парламенцкага сходу па культуры, навуцы і адукацыі.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# НЕ ЧАКАЮЦЬ, ПАКУЛЬ ПРЫГРЭЭ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Яшчэ мінулай восенню закрылі на рамонт некалькі кіламетраў адной з палос руху ў напрамку Гомель—Рэчыца. Да маразоў правялі падрыхтоўчыя работы, каб вясной можна было пачаць укладку асфальту. Летам дарожнікі плануюць скончыць работы. Між тым на тэрыторыі самога абласнога цэнтра ў дарожных службаў таксама значныя планы на гэты сезон.



Вядома, як гаспадаркі ўзімку актыўна рыхтуюцца да новага сельгассезона: рабочы працэс кіпіць у рамонтных майстэрнях — у гомельскіх дарожнікаў рамонтная кампанія цяпер таксама ў разгары. Амаль 650 кіламетраў вуліц другога па велічыні горада Беларусі абслугоўвае Гомельскі гарадскі дарожны будаўніча-рамонтны трэст.

— Рыхтуемся да сезона. Рамантуецца тэхніка: асфальтаўкладчыкі, каткі. Пастаўлена задача да першага сакавіка ўсю тэхніку поўнасцю падрыхтаваць і паставіць у строй. Акрамя таго, ідзе нарыхтоўка інертных матэрыялаў, якія вагонамі дастаўляюцца на асфальтабетонны завод, — распавёў **дырэктар Гомельскага гарадскога дарожнага будаўніча-рамонтнага трэста Віталь ЧАХЛОЎ.**

Шэсць брыгад трэста задзейнічаны ў ліквідацыі крытычнай ямачнасці на дарогах горада. Выконваюць гэтыя работы, як правіла, са снежня да канца лютага. Цяпер вядуцца работы па вуліцах Малайчука—Крупскай. Выбоіны дарожнага палатна рамантуюцца так званым халодным асфальтам ці арганамінеральнай сумессю, бо пакуль тэмпература паветра не дазваляе працаваць з гарачымі асфальтабетонамі.

— Калі ўмовы надвор'я дазваляюць, няма моцнага снегу і дажджу, загружаем у прычэп арганамінеральную сумесь і ўжо з васьмі раніцы прыступаем да работы на аб'екце, — патлумачыў **майстар участка па бягучым рамонце Гомельскага гарадскога дарожна-будаўнічага трэста Дзмітрый ШЫРОКІ.** Супрацоўнік якраз выехаў на аб'ект з брыгадай рабочых, таму выпала магчымасць распытаць падрабязна, як ідзе працэс аднаўлення дарожнага палатна з выбоінамі.

— Ямку агароджваем, высушваем, гэта важна — каб у сухую ямку класці асфальт. Пнеўмамалатком выбіваем беражкі ямкі, каб яны былі вертыкальнымі. Газам высушваецца яма, апрацоўваецца масцікай, пасля запаўняецца сумессю, якая таксама паступова праграваецца газам, сумесь трамбуецца, а ў канцы роўная паверхня і стыкі зноў апрацоўваюцца. Калі дазваляюць умовы надвор'я, брыгада выконвае ў змену да 20 «квадратаў» ямачнага рамонту, — патлумачыў Дзмітрый Шырокі.

Між тым асноўны рамонт гарадскіх вуліц стартуе з устанаўленнем дадатных тэмператур паветра. У гомельскіх дарожнікаў у сакавіку звычайна ўжо гарачая пара, але і цяпер, у лютым, таксама работы з ямачным рамонтам вуліц шмат. Асаблівая ўвага — ліквідацыі крытычнай ямачнасці на цэнтральных вуліцах. Ужо выкананы работы па ямачным рамонце дарогі ў раёне прыпынку «Вуліца Мазурава» Цэнтральнага раёна Гомеля. З пачатку лютага вядуцца работы па ўстараненні аварыйнай ямачнасці па вуліцах Крупскай і Малайчука.

— Пры ўстанаўленні спрыяльнага надвор'я аб'ём работ павялічыцца. Ужо ў сакавіку, пры надыходзе дадатных тэмператур у дзённы і начны час, калі сярэдняя тэмпература не будзе апускацца ніжэй за плюс пяць градусаў, будзе выконвацца рамонт гарачым асфальтабетонам, — звярнуў увагу Віталь Чахлоў. — На гэты год запланаваны рамонт вуліц так званымі вялікімі картамі, значнымі па плошчы ўчасткамі. Гэта дазваляе пазбегнуць разгортвання рамонтных работ на невялікіх участках, што не так эфектыўна. Як прыклад такога рэжыму працы — рамонт вуліцы Савецкай у мінулым годзе. Калі рабілі ў тым ліку і рамонт аўтобусных прыпынкаў, парковачных кішэняў грамадскага транспарту.

Вядома, што частыя «пераходы праз нуль» узімку — вельмі негатыўна ўплываюць на дарожнае палатно. Новыя матэрыялы, якія зараз выкарыстоўваюць дарожнікі, у тым ліку заклікаты зрабіць асфальтавае палатно дарогі больш устойлівым да гэтых перападаў. На Гомельскім гарадскім дарожным будаўніча-рамонтным трэсце толькі нядаўна скончыўся рамонт асфальтабетоннага завода. Цяпер ёсць магчымасць выпускаць друзава-мастычныя асфальтабетоны. Гэта той матэрыял, дзякуючы якому ў апошнія гады выконваўся рамонт асноўных транспартных артэрый абласнога цэнтра.

— Акрамя таго, у мінулым годзе мы закупілі лінію па вытворчасці бартавых камянёў драбнаштучнай пліткі. Цяпер ідзе мантаж лініі. Плануем з пачатку сезона запусціць вытворчасць бардзюрнага каменя і тратуарнай пліткі з магчымасцю выпуску каляровай тратуарнай пліткі. Так мы зможам выконваць уласнымі матэрыяламі рамонт і добраўпарадкаванне тратуараў і пешаходных зон, — дадаў кіраўнік будаўніча-рамонтнага трэста.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота аўтара.**

# ПРАВІЛЫ ПРАВЯДЗЕННЯ РЭКЛАМНАЙ ГУЛЬНІ «ЗВЯЗДА» — РУПЛІВЫМ ГАСПАДАРАМ»

## I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Рэкламная гульня пад назвай «Звязда» — руплівым гаспадарам» (далей — Гульня) праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з гэтымі Правіламі ў тэрмін з 15 лютага 2024 года да 30 чэрвеня 2024 года ўключна з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на другі квартал ці першае паўгоддзе 2024 года.

2. Арганізатар Гульні — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда» (далей — Установа), месца знаходжання: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, УНП 100155376.

## II. ПРЫЗАВЫ ФОНД ГУЛЬНІ

3. Прызавы фонд рэкламнай гульні «Звязда» — руплівым гаспадарам» сфарміраваны за кошт маёмасці арганізатара гульні — рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда» — і складаецца з наступных рэчаў:

| № | Назва | Колькасць (шт.) | Цана за шт. з ПДВ, руб. кап. | Усяго з ПДВ, руб. кап. |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Культыватар садовы Tomadica TOR-32TLR, (далей — суперпрыз) | 1 | 131,15 | 131,15 |
| 2. | Набор садовых інструментаў Garvill JC-507, (далей — прыз) | 7 | 63,035 | 441,25 |

УСЯГО прызавы фонд рэкламнай гульні «Звязда» — руплівым гаспадарам» складае 572,40 (пяцьсот семдзесят два) рублі 40 капеек.

## III. УМОВЫ ЎДЗЕЛУ Ў ГУЛЬНІ

4. Рэкламная гульня «Звязда» — руплівым гаспадарам» праводзіцца з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на другі квартал ці першае паўгоддзе 2024 года.

5. Удзельнікам Гульні можа быць любы грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае на яе тэрыторыі і які аформіў і аплаціў падпіску на газету «Звязда» на другі квартал ці першае паўгоддзе 2024 года.

6. Падставай для ўдзелу ў Гульні з'яўляецца дасланая падпісчыкам на адрас Установы ў перыяд з 15 лютага 2024 года да 19 красавіка 2024 года выразаная з газеты або з дадатковага ўкладыша запоўненая картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды», якая змяшчаецца ў газеце не менш чым раз на тыдзень у перыяд з 15 лютага да 19 красавіка 2024 года.

7. Адзін падпісчык можа даслаць толькі адну картку ўдзельніка. Падпісчык, які даслаў больш за адну картку ўдзельніка, выключаецца з Гульні.

8. Карткі ўдзельніка, наклееныя на паперу ці плёнку, адксеракапіраваныя або тыя, якія паступілі Установе пасля 25 красавіка 2024 года па паштовым штэмпелі атрымання, да ўдзелу ў Гульні не прымаюцца.

## IV. СКЛАД КАМІСІІ ПА ПРАВЯДЗЕННІ ГУЛЬНІ

9. Для правядзення Гульні Установа стварае камісію па правядзенні рэкламнай гульні (далей — Камісія) у наступным складзе:

Крачава Наталля Ільінічна — намеснік дырэктара рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда» — старшыня Камісіі;

Члены Камісіі:

Южык Жанна Міхайлаўна — галоўны таваразнавец РУП «Белдрук»;

Ганцарэвіч Святлана Міхайлаўна — загадчык аддзела рэалізацыі рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда»;

Доўнар Валянціна Аркадзьеўна — рэдактар аддзела рэдакцыі газеты «Звязда» рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда»;

Брашко Алег Мікалаевіч — загадчык адміністрацыйна-гаспадарчага сектара рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда».

10. Асобы, якія ўваходзяць у склад Камісіі, не могуць быць удзельнікамі гэтай Гульні.

## V. ПАРАДАК РОЗЫГРЫШУ ПРЫЗОЎ. ПАВЕДАМЛЕННЕ ПЕРАМОЖЦАМ

11. Розыгрыш прызоў ажыццяўляецца на пасяджэнні Камісіі 26 красавіка 2024 года ў 12 гадзін у памяшканні Установы па адрасе: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

12. Перад пачаткам розыгрышу карткі ўдзельнікаў сартуюцца па абласцях і горадзе Мінску, змяшчаюцца ў асобныя прасторныя скрыні і старанна перамешваюцца.

13. Асобна для кожнай вобласці і для горада Мінска разыгрываецца сем прызоў (па адным для кожнага).

Затым усе карткі змяшчаюцца ў адну скрыню, перамешваюцца і сярод удзельнікаў разыгрываецца суперпрыз.

Маруся была другой, але ж Антосевых сватоў бацькі прынялі, пачаставалі — дамовіліся, што вяселле зладзяць на Каляды (ЗАГСаў не было, вянчаў ды шлюб рэгістраваў бацюшка).

І вось той самы дзень. У сваёй больш заможнай сваячкі Антось пазычыў адмысловую брычку, разам са «світай» з найбліжэйшай радні хораша прыбраў яе і паехаў да царквы.

Нявеста са сваёй радзінай была ўжо на месцы — у прыгожым вышываным кажушку, у цёплай вялікай хустцы... Твар пад ёй не дужа і разгледзіш.

Але ж вось усе вясельнікі зайшлі ў царкву, распрануліся і... Што гэта? Ці не гром пасярод зімы? Замест Марусі — у вяночку яе старэйшая сястра! Хораша ўсміхаецца, смела бярэ Антося за руку (а яму няма як вырывацца: людзі ж вакол!), рашуча вядзе да бацюшкі...

Толькі потым, за вясельным сталом, малады змог неяк ачомацца, добра разгледзець нявесту: дзеўка як дзеўка — не брыдкая, вясёлая, шчаслівая... Высакаватая, праўда... Але ж з такой на сенакосе добра.

...Як паказала далейшае жыццё, — не толькі там. Маладыя паціху-памалу пабудавалі сваю хату, завялі гаспадарку, нарадзілі і выгадавалі чацвярых дзяцей. Антось у калгасе шафёрам працаваў, Люба — даяркай. У вёсцы іх вельмі паважалі.

Не засядзелася ў дзеўках і Маруся: за сваго аднавяскоўца замуж пайшла. Швагры паладзілі адразу: дапамагалі адзін аднаму, прыходзілі ў госці, жылі!

У мяне пытанне: а што ж гэта робіцца цяпер? Знаёмяцца, сустракаюцца, любяцца-кахаюцца, а пажэніцца — праз паўгода развод. Чаму? Вочы ж (не тое, што ў Антося) бачылі, што куплялі?

**Ніна Горгуль,**
*г. Мінск.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

**Ад яе ж,** і ў працяг апошняй гісторыі — хатняе заданне.

У аднаго ну вельмі талковага бацькі (разумнага, багатага, добрага, майстравога...) было аж тры дарослыя дачкі — хоць сёння замуж выдавай! Прычым — усіх! Але... за каго, калі на гарызонце — ну нікога вартага!

Перажываў бацька, малілася маці і такі ж вымалілі — з'явіўся жаніх! Якраз той, што патрэбна!.. Пагасціў у гэтай сям'і, пабачыў нявест, у адну закахаўся без памяці, — згодны жаніцца!.. Але ж як пра гэта сказаць, каб сясцёр не пакрыўдзіць, каб, крый бог, бацькоў не прагнявіць?

Думаў ён думаў і прыдумаў: папрасіў прынесці тры аднолькавыя чайнікі, у кожны з іх — наліць вады (пароўну!), усе тры паставіць на пліту... У каторай з дзяўчын вада закіпіць найперш, тая за жонку стане.

Як надумалі ў тым доме, — так зрабілі: чайнікі ўжо на пліце.

Пытанне: якая з трох сясцёр — старэйшая, сярэдняя ці малодшая — стане жонкай гэтага вынаходніка? Ёсць здагадкі? Пішыце!




Малюнак Анатолія ГАРМАЗЫ.

Неасабісты суб'ектыў



# Аранжавы ўзровень

## Галалёдзіца як нагода пагаварыць пра выхаванне

НА чацвер сіноптыкі папярэдзілі пра аранжавы ўзровень небяспекі з-за слізготы. Была яна ўжо і ў сераду ўвечары, як толькі пачало падмарожваць. На пачышчаных тратуарах яшчэ нічога — яны былі ўжо практычна сухія, толькі дзе-нідзе блішчэлі плямы тонкага лёду. А вось калі збочыла з вуліцы ў двары, каб скараціць шлях, — ледзве ногі не паламала. Ішла ў падсвечаных ліхтарамі цемры па яшчэ не пасыпаных ледзяных грудах, падварочвала абцасы, старалася не адрываць падэшвы ад слізкай паверхні. Сама сябе супакойвала: нічога, гэта яшчэ не страшна. Успомні лепш, як Зорку паіла...

Галалёдзіца зімой як з'ява стала ў вёсцы рэальнасцю ў канцы 80-х — пачатку 90-х мінулага стагоддзя. Да гэтага, канешне, былі наслізганыя палазамі саняў месцы на дарозе, дзе можна было добра-такі грымнуцца. Але каб так — калі снег, які выпаў і меўся ляжаць да вясны, падтаўшы ад нечаканага пацяплення, а пасля яшчэ і паліты студзеньскім дажджом, ператварыўся ў суцэльны каток... Такога не памяталі нават нашы бабулі, дзівіліся, паўшэптам прадракалі хуткі канец свету. Пра глабальнае пацяпленне тады яшчэ шмат не казалі, затое ва ўсіх на слыху былі нядаўняя аварыя ў Чарнобылі і перабудова... Нечаканае пацяпленне і абледзянелае наваколле ўспрымалася тады як лагічны працяг катастрофы, у цэнтры якой нам собіла апынуцца.

ЗРЭШТЫ, жыццё працягвалася. Па палітай вадой абледзянелай дарозе неяк штодня дабіраліся да школы ў суседнюю вёску (а ў нас жа самая высокая кропка краіны побач, так што дарога тая была — з узгорка на ўзгорак). У час суцэльнага дэфіцыту з'явіўся яшчэ адзін тавар, якога было не дастаць у вясковай аптэцы, — звычайны белы лейкапластыр. Яго клеілі на падэшвы абутку, і шурпаватая паверхня хоць на нейкі час падстрахоўвала ад падзення, не давала нагам раз'язджацца. Дапамагала не вельмі: падалі на мокры лёд, падымаліся, ішлі далей, чухаючы пабітыя месцы... Але сапраўдны «трэш», кажучы мовай сённяшняй моладзі, пачынаўся дома. На нашай «кулацкай» даваеннай сядзібе хлеў стаіць насупраць хаты на другім баку вуліцы, ды яшчэ і на ўзгорку. І вось туды па гэтым суцэльным галалёдзе трэба было цягнуць поўныя вёдры: свінням з ежай, карове — з вадой. Калодзежа каля хаты не было, даводзілася ісці да суседзяў... Зорка наша была рагуля вялікая, як гара, і выпівала чатыры вядры сама меней. Карацей, адно з самых яркіх уражанняў юнацтва — атракцыён «Напаіць Зорку»: прайсці з поўнымі вёдрамі вады па абледзянелай паверхні і не паваліцца.

СКАЖЫ каму цяпер, што гэта рабіла худое шаснаццацігадовае дзяўчо... Прычым без ніякага форс-мажору, без ніякай вымушанай неабходнасці. Гэта было — нармальна. Як нармальна было і тое, што пасля другога класа бабуля дала ў рукі граблі і паказала, як правільна іх трымаць. А мама паказала другакласніцы, як уключаць газавую пліту, навучыла, як парэзаць на патэльню скварку і ўзбіць пасля яйка. Як нармальна было, што пасля чацвёртага класа мяне навучылі даіць карову. Як нармальна было, што дзялку сена мы фактычна высушвалі ўдзвюх са стрыечнай сястрой-равесніцай, якая прыязджала з горада, і было нам тады па трынаццаць-чатырнаццаць гадоў. Як нармальна было, выйшаўшы з пачатковай школы, дапамагаць старэйшым палоць буракі і рваць лён. Прычым, заўважу, вясковыя і гарадскія дзеці (прынамсі, тыя, што прыязджалі на канікулы ў вёску, — а такіх было большасць) у гэтым плане зусім не адрозніваліся — працавалі ўсе.

У дзясятым класе я ўвогуле забрала ў мамы вячэрнія клопаты па гаспадарцы, яна нават не заходзіла ў хлеў. І, несучы вёдры вады па слізкай вуліцы, я не ўспрымала гэта як нейкую павіннасць, хутчэй як прыгоду. І нават у галаву не прыходзіла думка накшталт: чаму я павінна гэта рабіць?.. І гэта не перашкаджала мне выдатна вучыцца, удзельнічаць і перамагаць у рэспубліканскіх алімпіядах, пісаць вершы, рыхтавацца да паступлення ва ўніверсітэт.

ТУТ яшчэ, напэўна, трэба напісаць (бо, можа, хто сумняваецца), што ў нас было сапраўды шчаслівае дзяцінства і юнацтва. У нашым жыцці былі шчаняты-кацяняты (а яшчэ і мокрыя, толькі з яйка, кураняты, якіх сушылі пад настольнай лямпай, і сьцеканькія блакітнавокія парасяты, якіх выпойвалі з соскі на печы). Мы паспявалі збегаць тры разы на дзень пакупацца ў возеры, схадзіць у грыбы, пагуляць у «выбівалы», паглядзець «Госцю з будучыні» па чорна-белым тэлевізары, пачытаць «У краіне райскай птушкі» ці «Трох мушкецёраў», выбрацца ў экспедыцыю на былую панскую сядзібу. У старэйшых класах не прапускалі ніводнай дыскатэкі ў саўгасным Доме культуры (восем кіламетраў туды, восем назад — хіба гэта адлегласць?). І ніхто ніколі не скардзіўся, што старэйшыя прымушаюць дапамагаць па гаспадарцы — гэта дапамога была арганічнай часткай жыцця, сведчаннем тваёй далучанасці да сям'і... Гэта, можна сказаць, адна з нашых нацыянальных спрадвечных традыцый. Аб неабходнасці захавання якіх як галоўных каштоўнасцяў сёння гаворым часта і шмат, бо яны сёння дзесьці тоесныя захаванню незалежнасці.

ДЫК вось з захаваннем гэтай традыцыі ў нас, здаецца, праблемы. У нас расце пакаленне лайдакоў. Не, яны нармальныя дзеці, стараннія, добра вучацца, разбіраюцца ў камп'ютары, тэлефоны ў іх увогуле як працяг рук. А вось што датычыцца фізічнай працы — нават не даволі цяжкай вясковай, а проста пабытавых, гаспадарчых рэчаў... Не ад адных знаёмых чула: мала таго што нашчадка на дачу на вяроўцы не зацягнеш, дык яшчэ і, вярнуўшыся з дачы, даводзіцца за нашчадкам прыбіраць і посуд мыць. І тут жа знаходзім нашчадку апраўданне: ён жа (яна ж) вучыцца, дый адпачываць дзіцяці трэба.

МОЖА, нічога ў гэтым страшнага няма — іншы час, іншыя норавы. А вось здарыцца ў жыцці гэтага дзіцяці аранжавы ўзровень, калі нас не будзе побач. І што яму тады дапаможа ўтрымацца на нагах і не ўпасці?..

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**

# ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ООО «Профитсистем»

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток (7 %), бел. руб. | Шаг аукциона (5 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инвентарным номером 601/С-15317 (назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование – пристройка к мебельному цеху, общая площадь – 523,3 кв. м, составные части и принадлежности – одноэтажная кирпичная пристройка к мебельному цеху А1/к); барабан сушильный АВМ 1,5, инв. № 70068; бункер БН Ф3.30.00 СБ, инв. № 49306001; бункер М 402.02.00.СБ, инв. № 70081; весы платформенные ВСП-4 2000 (1500*1250) РФ, инв. № 47035002; весы электр. лабарат. ВК-3000 имп. РБ, инв. № 47040001; винтовой конвейер (желоб, трубовал, витки, шнек, мотор-редуктор, муфта), инв. № 41714005; гидростанция STNG2-80-K7.5-0225/A120 (имп. РБ), инв. № 46132009; дробилка молотковая, инв. № 971; дробилка молотковая ДМ-10 с двиг. 45 кВт, инв. № 50426522; дымосос ДН-11,2, инв. № 50426254; емкость металлич. 50 куб. м, инв. № 70223; емкость металлич 50 куб. м, инв. № 70224; емкость металлич. 75 куб. м, инв. № 70225; конвеер ленточный, инв. № 50426135; конвейер винтовой в желобе вертикальный ф300*4,07м с электромот. N=3,0 кВт, РБ, инв. № 41714002; конвейер винтовой в желобе горизонтальный ф260*4,06м с электромот. N=2,2 кВт, РБ, инв. № 41714001; конвейер винтовой ф350мм L=3800 мотор-редуктор 1,1 кВт, инв. № 41714003; ленточн. транспортер в упаковку мешками, инв. № 70060; охладитель-сортировка, инв. № 70139; пеллетоупаковщик SYNTHASI с загр. рамой, инв. № 50426338; пневмотранспорт сухой щепы, инв. № 70136; пневмотранспорт удаления мелкой фракции, инв. № 70140; преобразователь частоты INNOVERT VENT IVD113B43A (11,0кВт*380В) выходной ток 24А, инв. № 40709004; пресгранулятор, инв. № 962; сварочное устройство, инв. № 70067; скребковый транспортер, инв. № 50026-1; скребковый транспортер на охладитель, инв. № 70138; скребковый транспортер (на топку), инв. № 70133; сортировка, инв. № 70127; стол произв. металлический размер 950*600*860, инв. № 70013003; стружкоотсос (пылесос) ОР-1500 (на 1 мешок, 220 вольт, 1,5 кВт) (Россия в РБ), инв. № 41602001; топка 1,5МВт, инв. № 70134; транспорт. система накоп. и под. сух. сырья, инв. № 70152; транспортная система подачи исходного сырья, инв. № 70126; упаковочное устр-во-автомат, инв. № 70061; устройство низковольтное комплектное ШРС-02-225/400-IP54-УЗ (шкаф распределит. силовой), инв. № 40703004; устройство низковольтное комплектное ШУД-01-200/400-IP54-УЗ (шкаф управления дробилкой), инв. № 40703003; циклон СБ, инв. № 41600003; шкаф ПР85+счетчик СА4У-699М, инв. № 70104; шкаф распред. ШР-11-73505, инв. № 30039; шкаф упр. топкой+частот. преобр., инв. № 70143; эл./пульт упр-я производством, инв. № 70058<br><br>Капитальное строение с инвентарным номером 601/С-17452 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование склад, общая площадь – 53,9 кв. м, составные части и принадлежности – одноэтажный кирпичный склад)<br><br>Капитальное строение с инвентарным номером 601/С-15322 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – складское помещение, общая площадь – 286 кв. м, составные части и принадлежности – одноэтажное кирпичное складское помещение с пристройкой основного назначения Б1/к); бойлер Pellets Fuzzy Logic, инв. № 50426289; кондиционер IGC 09AX (внутренний RAS+наружный RAC – блоки), инв. № 70041015; Кондиционер IGC 12AX (внутренний RAS+наружный RAC – блоки), инв. № 70041016; водонагреватель накопительный электрический ER 200 V THERMEX, инв. № 70103006<br><br>Капитальное строение с инвентарным номером 601/С-17454 (назначение – здание специализированное энергетики, наименование – здание трансформаторной подстанции, общая площадь – 44,3 кв. м, составные части и принадлежности – двухэтажное кирпичное здание трансформаторной подстанции А2/к); трансформатор 400, инв. № 50426146; трансформатор ТМГ12-340/10-У1 10/0, 4 Квт Д/УН -11, РБ, инв. № 40701001; кабельные линии эл. перед., инв. № 30100-1<br><br>Капитальное строение с инвентарным номером 601/С-15318 (назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование – мебельный цех, общая площадь – 1146,6 кв. м, составные части и принадлежности – одноэтажный кирпичный мебельный цех с двумя пристройками 1Б1/к, 1В1/к); навес над рампой мебельного цеха, инв. № 20349004; система пожарной сигнализации и оповещения о пожаре (меб. цех), инв. № 47075001; ворота секционные 2150*2900 (меб. цех), инв. № 70036004; ворота секционные подъемн. СПР ProTrend 1950*2870 (меб. цех), инв. № 70036015; жалюзи-роллета 1100*23 00 ЖЗ AER44/s ПИМ 102, инв. № 70019016; жалюзи-роллета 1530*23 00 ЖЗ AER44/s ПИМ 102, инв. № 70019015; котёл Pelet Fuzzy Logic, инв. № 50426385; котел автомат. тв/топл. (гранул.) 50 кВт, имп., инв. № 40002003; пожарный шкаф – пожарный инвентарь, инв. № 70000002; пожарный шкаф – пожарный инвентарь, инв. № 70000004; пожарный щит – пожарный инвентарь, инв. № 70000003; система вентиляционной в покрасочн. камере МЦ, инв. № 41602021; Шкаф ШР-11, инв. № 50426112; молниеотвод, инв. № 20608001<br><br>Капитальное строение с инвентарным номером 601/С-15313 (назначение – здание обрабатывающей промышленности иного назначения, наименование – цех оцилиндровки (цех хозобихода № 1), общая площадь – 575,6 кв. м, составные части и принадлежности – одноэтажный металлический цех оцилиндровки с тремя пристройками основного назначения Б1/к, В1/к, Г1/бл); ворота роллетные (ЦДО), инв. № 70036002; кран мост. опорн. г.п. 3,2 т., инв. № 30123; рельсовый путь с грузовый тележкой, инв. № 44105; Подкрановая эстакада 35П, инв. № 30174; электро-тельфер 13Т45516 г/п3.2т Н=6м, инв. № 50426043; тележка цеховая, инв. № 30182; теплогенератор ТГ-300, инв. № 40115<br><br>Капитальное строение с инвентарным номером 601/С-15316 (назначение – здание неустановленного назначения наименование – цех распиловки хозобихода № 2, общая площадь – 542,5 кв. м, составные части и принадлежности – одноэтажный металлический цех распиловки хозобихода с пристройкой Б1/к); ворота секционные 4775*3500, инв. № 70336; кран мостовой опорный однобалочный г.п. 3,2 т, инв. № 41702001; таль электрическая г/п -3,2т, в/п- 6,0м (13Т 45516), инв. № 41721002; шкаф ШР-11 инд. проект, инв. № 50426170<br><br>Капитальное строение с инвентарным номером 601/С-15315 (назначение – здание неустановленного назначения, наименование – караульное помещение, общая площадь – 29,6 кв. м, составные части и принадлежности – одноэтажное блочное караульное помещение)<br><br>Капитальное строение с инвентарным номером 601/С-16172 (назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – гараж, общая площадь – 175,4 кв. м, составные части и принадлежности – одноэтажный кирпичный гараж с двумя пристройками 2Б1/бл, 2В1/бл, навесом 1); ворота секционные подъемн.СП.Р.Trend -TS.Г.КП.3100*2850 RAL8017 (гараж 50426074), инв. № 70036016; ворота роллетные (гараж), инв. № 70036001<br><br>Капитальное строение с инвентарным номером 601/С-17453 (назначение – сооружения неустановленного назначения, наименование – объекты благоустройства производственной базы, перечень объектов, входящих в состав – ограждение, ворота, проезжая часть, общая площадь проезжей части – 5995 кв. м, общая длина ограждений – 596,5 м) | 3648636,00 | 255404,52 | 182431,80 |
| 2 | Капитальное строение с инвентарным номером 601/С-21429 (назначение – сооружение специализированное обрабатывающей промышленности, наименование – навес для хранения ГП 1, площадь застройки – 113 кв. м, составные части и принадлежности – навес для хранения ГП 1) | 6960,00 | 487,20 | 348,00 |
| 3 | Капитальное строение с инвентарным номером 601/С-21428 (назначение – сооружение специализированное обрабатывающей промышленности, наименование – навес для хранения ГП 2, площадь застройки – 114 кв. м, составные части и принадлежности – навес для хранения ГП 2) | 6960,00 | 487,20 | 348,00 |
| 4 | Капитальное строение с инвентарным номером 601/С-21430 (назначение – сооружение специализированное обрабатывающей промышленности, наименование – навес для хранения ГП 3, площадь застройки – 113 кв. м, составные части и принадлежности – навес для хранения ГП 3) | 6720,00 | 470,40 | 336,00 |
| 5 | Капитальное строение с инвентарным номером 601/С-21431 (назначение – сооружение специализированное обрабатывающей промышленности, наименование – навес под пропитку № 3, площадь застройки – 166 кв. м, составные части и принадлежности – навес под пропитку № 3) | 9840,00 | 688,80 | 492,00 |
| 6 | Капитальное строение с инвентарным номером 601/С-21427 (назначение – сооружение специализированное обрабатывающей промышленности, наименование – навес для складирования щепы, площадь застройки – 337 кв. м, составные части и принадлежности – навес для складирования щепы) | 20160,00 | 1411,20 | 1008,00 |
| 7 | Навес с деревянными столбами для велосипедов, инв. № 20349001 | 1680,00 | 117,60 | 84,00 |
| 8 | Комплект оцинкован. инвентарн. навеса сборно-разборного типа 42*10*4,5(М-С2-3-06-В-0336) РБ, инв. № 20348000 | 56760,00 | 3973,20 | 2838,00 |
| 9 | Комплект оцинкован. инвентарн. навеса сборно-разборного типа 50*14*4,5(М-С2-3-06-В-0700) РБ, инв. № 20348001 | 119760,00 | 8383,20 | 5988,00 |
| 10 | Изолированное помещение с инвентарным номером 601/D-4550 (назначение – квартира, наименование – квартира, общая площадь – 50,6 кв. м); вытяжка кухонная Germes Честер, инв. № 70030062; комплект корпускной кухонной мебели (7 шкафов + столешница), инв. № 70030053; мойка L65848-6R Ledeme + смеситель для кухни Ledeme L5913-1, инв. № 70030061; плита газовая бытовая 4-х горелочная GEFEST ПГ 1200С5, инв. № 70103003; раковина Керамин «Верона 60» + пъедестал под умывальник + крепление для умывальника, инв. № 70030063 | 97776,00 | 6844,32 | 4888,80 |
| 11 | Капитальное строение с инвентарным номером 601/С-31986 (назначение – здание специализированное коммунального хозяйства, наименование – блочно-модульная котельная на твердом топливе, общая площадь – 143 кв. м, составные части и принадлежности – одноэтажная сэндвич-панельная блочно-модульная котельная на твердом топливе с навесом а, дымовой трубой б); установка водогрейная тв/топл. УВТ-1000Е (РФ), инв. № 40002004; бак мембранный N 800/6 Reflex (Германия), инв. № 42923001; генератор HONDA SILENT DIESEL GENERATOR EXT 12D, 2002 г., б/у, инв. № 40205005; Компрессор Remeza СБ4/Ф270.LB75, инв. № 41400004; оборудование автоматизированного склада топлива СТ. 1350-2-15 (РФ), инв. № 44020015; осушитель охлаждающий RFD31, DR001060, инв. № 41417001; система удаления золы за пределы котельной ТЗУ 300.15 (РФ), инв. № 41711009; скребковый транспортер с мотор-редуктором ТС.300.8 (РФ), инв. № 41711008; установка компрессорная СБ4/С-100 LB40, инв. № 41400001; установка умягчения воды ФИ-Na-2-20 0/020 (РБ), инв. № 49010001; сушильный комплекс конвекционного типа мод.4EPL85/72/41.Secal (Италия), инв. № 44500003; трубопровод технологический, инв. № 30116001 | 1655124,00 | 115858,68 | 82756,20 |
| 12 | Емкость для пропитки ЦДО 3.06.001, инв. № 50426492; подъемник гидравл. NF20R, инв. № 30046 | 11760,00 | 823,20 | 588,00 |
| 13 | Бревнотаска БР-37.ПТ5504, инв. № 30083; кран мостовой опор. г. г. 5 т., инв. № 30134; кран мостовой 5тс, инв. № 30062; таль эл-кая канатная 13ГК 10636, инв. № 50426361; транспортер поперечн. ЛОТ 1-01, инв. № 30125; электротельфер EKN20 MHL 6-25 2/1 H12 V8 C (г/п 5, в/п 12м) Болгария имп. в РБ, инв. № 41721003; эстакада бревн. мет. ПТ550, инв. № 30131 | 99600,00 | 6972,00 | 4980,00 |

В отношении лотов №№ 1–13 проводятся первые торги

**Местонахождение лотов №№ 1–9, 12, 13:** Минская обл., Логойский р-н, г. п. Плещеницы, ул. Чапаева, 40.
**Местонахождение лота № 10:** Минская обл., Логойский р-н, г. п. Плещеницы, микрорайон «Военный городок», д. 6, кв. 47.
**Местонахождение лота № 11:** Минская обл., Логойский р-н, г. п. Плещеницы, ул. Чапаева, 40/1; Минская обл., Логойский р-н, г. п. Плещеницы, ул. Чапаева, 40

Лоты №№ 1–9, 11–13 расположены на земельном участке с кадастровым номером 623255700001001900, площадь 2,6116 га, целевое назначение - для обслуживания и эксплуатации зданий и сооружений, на праве аренды до 28.11.2026 **(залог права аренды у ОАО «Приорбанк»)**

В отношении частей лотов №№ 1, 11 имеется ограничение (обременение) в виде залога (залогодержатель – ОАО «Приорбанк»)

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | **13 марта 2024 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | с 10.00 9 февраля 2024 года до 16.00 11 марта 2024 года |

**Условия для участия в торгах:**

1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: OTHR 40901. Задаток для участия в торгах по Лоту __, ООО «Профитсистем», проводимых 13.03.2024.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2-х экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов).
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона.

**Вознаграждение аукциониста в отношении лота № 1 – 5 %, в отношении лотов №№ 2–13 – 7 % от конечной цены предмета торгов.**

Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 (десяти) календарных дней с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 30 (тридцати) календарных дней со дня проведения торгов.

6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info/.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов: **+375292751275 Виноградов Дмитрий Алексеевич (понедельник–пятница с 9.00 по 17.00).**
8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.
9. Государственная регистрация (удостоверение) договора купли-продажи недвижимого имущества и возникающих на его основании прав осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет

| | |
|---|---|
| **Информация о продавце** | **ООО «Профитсистем», в лице ликвидатора – ООО «Партнёр-Консультант», тел. +375173958917 (220040, г. Минск, ул. Достоевского, 27)** |
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера» 220113 г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg** |

# Информация об объявленных повторных электронных торгах и предмете повторных электронных торгов

Организатор электронных торгов – **комитет государственного имущества Минского городского исполнительного комитета** (УНП 100048181).
Продавец – **государственное объединение «Белорусская железная дорога».**
Оператор электронной торговой площадки – **РУП «Институт недвижимости и оценки».**
Электронный адрес электронной торговой площадки – **https://gostorg.by**

| Дата электронных торгов | Сведения о предмете электронных торгов | Местонахождение имущества | Начальная цена, руб. | Информация о публикации извещения |
|---|---|---|---|---|
| 23.02.2024 | Комплекс из 4 зданий с инженерными коммуникациями.<br>Право аренды земельного участка площадью 0,2764 га, срок аренды – 5 лет со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах электронных торгов либо признании электронных торгов несостоявшимися | г. Минск, ул. Аннаева, 84Б, 84Б/1, 84Б/2, 84Б/3 | 280 250,51 | Извещение о проведении электронных торгов опубликовано на сайтах **https://au.nca.by/item/7674259** и **https://minsk.gov.by/ru/freepage/other/prodazha_arenda/** |

УНП 100048181





# У БРЭСЦЕ ПАПУЛЯРЫЗУЮЦЬ КІТАЙСКУЮ КУЛЬТУРУ

**У Рэспубліцы Беларусь склалася сістэма па вывучэнні кітайскай мовы і знаёмстве з кітайскай культурай. Найперш — праз шэраг інстытутаў кітаязнаўства імя Канфуцыя. Адзін з іх працуе і ў Брэсцкім дзяржаўным універсітэце імя А. С. Пушкіна. Шмат робіцца і ў бібліятэках краіны па прэзентацыі кітайскай кнігі, кітайскай літаратуры.**

Як прыклад — і новы творчы праект: з 5 да 13 сакавіка ў Брэсце пройдуць Дні папулярызацыі кітайскай культуры і літаратуры. Арганізатары гэтага шматабсяжнага свята: Брэсцкая абласная бібліятэка імя М. Горкага, Саюз пісьменнікаў Беларусі, Выдавецкі дом «Звязда», Інстытут Канфуцыя Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна.

Сярод іншых мерапрыемстваў кітайскіх дзён — і прадстаўленне серыі «Светлыя знакі: паэты Кітая», якая выходзіла з 2014 да 2019 года ў Выдавецкім доме «Звязда» і выдавецтве «Мастацкая літаратура». Пабачылі свет 14 кніг: зборнікі Ван Вэя, Ай Ціна, Лі Бо, Ду Фу, Вэнь Ідо, Сюй Чжыма, Лі Цінчжаа і іншых класікаў і сучаснікаў. Цяпер серыя ўзнаўляецца, рыхтуецца новы зборнік: з вершамі кітайскай моладзі, студэнтаў факультэта журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

**Раман СЭРВАЧ.**

Надвор'е

# То хлюпота, то мароз

**Калі на поўдні краіны нават ноччу невялікі плюс, у гэты час на паўночным усходзе — упэўнены мінус**

**Гэтымі днямі на тэрыторыі нашай краіны будуць досыць кантрасныя ўмовы надвор'я. Розныя атмасферныя франты падзеляць краіну на дзве ўмоўныя зоны — цёплую і халодную.**

Сапраўдны начны холад пачне зацягвацца на поўнач нашай краіны ўжо ў гэтую пятніцу. Умовы надвор'я ў Беларусі ў асноўным будзе вызначаць вобласць павышанага атмасфернага ціску ў паўднёвых раёнах, а ўначы і па поўначы краіны адаб'ецца ўплыў франтальных раздзелаў. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 1 градуса па паўднёвым захадзе да 11 марозу па паўночным усходзе краіны, пры праясненнях паветра будзе астуджацца да 12—15 градусаў ніжэй за нуль. Максімальная тэмпература днём складзе ад мінус 4 градусаў да 2 цяпла. Атмасферны ціск ноччу істотна не зменіцца, днём будзе слаба расці.

Кантраснасць яшчэ больш павялічыцца ў другую суботу лютага. У гэты дзень умовы надвор'я ў асноўным будзе фарміраваць атмасферны фронт, які ссоўваецца з тэрыторыі Польшчы, а ў паўночных рэгіёнах захаваецца ўплыў халоднай вобласці павышанага атмасфернага ціску. Тэмпература паветра ўначы будзе ад нуля градусаў па паўднёвым захадзе да мінус 18 градусаў па паўночным усходзе. Удзень у паўднёва-заходніх раёнах будзе амаль вясна (плюс 2 — плюс 4 градусы), а ў паўночна-ўсходніх раёнах класічная зіма — да мінус 7 градусаў.

У пачатку лютага надвор'е стане мякчэйшым. У нядзелю да нас у краіну прыйдзе атмасферны фронт, за якім будзе наступаць цёплая паветраная маса з поўдня Еўропы.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Заход | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.42 | 18.05 | 9.23 |
| Віцебск — | 8.36 | 17.51 | 9.15 |
| Магілёў — | 8.33 | 17.56 | 9.23 |
| Гомель — | 8.25 | 17.57 | 9.32 |
| Гродна — | 8.57 | 18.21 | 9.24 |
| Брэст — | 8.53 | 18.26 | 9.33 |

## Месяц

*Апошняя квадра 3 лютага.*
*Месяц у сузор'і Вадаліва.*

## Імяніны

**Пр.** *Івана.*
**К.** *Апалоніі, Бярнарды, Сабіны, Бярнарда, Кірыла, Раймунда, Эрыка.*



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

# ЗАЎТРА




# 9 ЛЮТАГА

Даты | Падзеі | Людзі

У краіне



**1547** год — нарадзіўся Хрыстафор Радзівіл, ваенны і дзяржаўны дзеяч ВКЛ. Удзельнік Лівонскай вайны (1558—1583). З 1584 года — ваявода Віленскі. Пасля смерці Стэфана Баторыя падтрымліваў план часткі магнатаў і шляхты ВКЛ выбраць каралём маскоўскага цара Фёдара Іванавіча і стварыць дзяржаўную унію Польшчы, ВКЛ і Расіі на чале з ВКЛ. З 1589 года — вялікі гетман ВКЛ.

**1852** год — у Мінску ўпершыню пастаўлена опера «Ідылія» («Сялянка») на лібрэта В. Дуніна-Марцінкевіча. Гэты своеасаблівы оперна-драматычны твор быў напісаны ў 1842—1844 гадах. Музыку да тэксту напісалі сябры Дуніна-Марцінкевіча — кампазітар Станіслаў Манюшка і скрыпач Канстанцін Кржыжаноўскі. Прэм'ера адбылася на сцэне Мінскага гарадскога тэатра.

**1899** год — нарадзіўся Іван Дзмітрыевіч Мішэнін, беларускі вучоны ў галіне тэрапіі, акадэмік НАН Беларусі, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Беларусі. Распрацаваў і ўкараніў у практыку лячэбнай работы арыгінальныя метады пальпацыі печані, пералівання крыві. Аўтар больш за 120 навуковых работ.

**1919** год — утвораны Камуністычны саюз моладзі Літвы і Беларусі (КСМЛіБ). Аб'ядноўваў моладзь Літоўска-Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. Працаваў пад кіраўніцтвам КП(Б)ЛіБ, ЦК РКСМ. Накіроўваў камсамольцаў і моладзь на франты грамадзянскай вайны, удзельнічаў у аднаўленні народнай гаспадаркі, праводзіў культурна-асветную работу. Пасля акупацыі польскімі інтэрвентамі Вільні, а затым і Мінска ЦК КСМЛіБ пераехаў у Смаленск. У 1919 годзе КСМЛіБ быў членам-заснавальнікам Камуністычнага інтэрнацыяналу моладзі (КІМ). У верасні 1920 года КСМЛіБ падзелены на дзве арганізацыі — Камуністычны саюз моладзі Беларусі і КСМ Літвы.

У свеце

**1441** год — нарадзіўся Алішэр Наваі, паэт Усходу, філосаф-суфіст, дзяржаўны дзеяч цімурыдскага Харасана.

**1667** год — заключана Андрусаўскае перамір'е паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай, якое паклала канец ваенным дзеянням у руска-польскай вайне 1654—1667 гадоў. Назва паходзіць ад вёскі Андрусава (цяпер Смаленская вобласць), у якой яно была падпісана. Было пацверджана «Вечным мірам» у 1686 годзе. Па выніках дагавора Кіеў і левабярэжная Украіна перайшлі пад уладу Расіі.

**1874** год — нарадзіўся Усевалад Эмільевіч Меерхольд, савецкі тэатральны рэжысёр, акцёр і педагог. Тэарэтык і практык тэатральнага гратэску, аўтар праграмы «Тэатральны Кастрычнік» і стваральнік акцёрскай сістэмы, якая атрымала назву «біямеханіка», народны артыст РСФСР. Неабгрунтавана рэпрэсіраваны; рэабілітаваны пасмяротна.



**1887** год — нарадзіўся Васіль Іванавіч Чапаеў, легендарны камдыў часоў Грамадзянскай вайны. З 1918 года камандаваў атрадам, брыгадай і 25-й стралковай дывізіяй, якая выканала значную ролю ў разгроме войскаў Калчака ўлетку 1919-га. Загінуў у баі. Вобраз Чапаева — у рамане Д. Фурманава «Чапаеў» і аднайменным кінафільме. У Беларусі яго імем названы вуліцы, сельгаспрадпрыемствы. У гады Вялікай Айчыннай вайны ў Беларусі імя Чапаева насілі сем партызанскіх брыгад і дзясяткі атрадаў.

Так гаварыў...

**ТОМАС МАКАЛЕЙ:**

*«Рабіць грошы без рэкламы можа толькі манетны двор».*

# УСМІХНЕМСЯ

**— Чаму боршч такі вадкі і без мяса?!**

**— Не ведаю. Я варыла дакладна па рэцэпце з кулінарнай кнігі, якая засталася ад тваёй прапрабабулі.**

**— І што там напісана?**

**— «Вазьмі мяса на дзесяць капеек»...**

У гэтым годзе я сэканоміў 300 рублёў, кінуўшы піць алкаголь!

Прычым усе 300 за мінулыя выхадныя.

**Правілы дарожнага руху — гэта навука аб тым, як правільна зберагчы змесціва свайго кашалька ад драпежных даішнікаў.**



ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 10.986. Індэкс 63850. Зак. № 366.

Нумар падпісаны ў 19.30 8 лютага 2024 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12